АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ПАДРЫХТОЎКІ АРГАНІЗАТАРАЎ
ЭКАЛАГІЧНАГА РУХУ Ў ІНСТЫТУЦЕ КУЛЬТУРЫ

М.І.Акощік

Абвастрэнне узаемаадносін чалавека і прыроды надае асобую актуальнасць пытанням экалагічнага выхавання людзей. Пануючая на працягу стагоддзяў тэндэнцыя утылітарных адносін да навакольнага асяроддзя дэфармавала свядомасць чалавека, які разглядаў прыроду толькі ў якасці сродка для задавальнення сваіх шматлікіх запатрабаванняў. У сувязі з гэтым сістэма выхавання ў асноўным была з'арыентавана на вузка практычныя адносіны да прыроды, а не духоўныя, эстэтычныя каштоўнасці ўвогуле не браліся да ўвагі.

Сення многа увагі экалагічным праблемам удзяляюць сродкі масавай інфармацыі, друк, актывізуецца грамадская думка ў гэтым накірунку. Аднак усе пазітыўныя намаганні можна акрэсліць адным паняццем – "б'юць трывогу". Сення відавочна, што адной канстатацыі экалагічных праблем, якіх, нажаль, ад гэтага меньш не становіцца, ўжо нестае. Неабходна дакладная праграма экалагічнай адукацыі і выхавання людзей, у тым ліку і ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай школы.

Выкладаемы дагэтуль курс "Ахова прыроды" ужо неадпавядае патрабаванням сенешняга дня. Калі ў тэхнічных вузах ен яшчэ мае нейкую практычную падставу, то ў інстытуце культуры з'яўляецца увогуле абстрактным, адарваным ад будучай прафесіі студэнта.

Разам з тым, толькі ў інстытуце культуры, і зыходзячы са спецыфікі падрыхтоўкі будучага арганізатара сацыя-культурнай сферы, магчыма разглядання экалагічных праблем ў святле гуманістычных традыцый праз узаемасувязь прыроды і культуры. Экалагічную падрыхтоўку студэнтаў інстытута культуры можна падзяліць на уласную і на сацыяльную, неабходную ў будучай прафесіі.

Уласна экалагічная адукацыя ажыццяўляецца праз выкладанне дысцыпліны "Экалогія і культура" (замест існуючага "Ахова прыроды"), якая уключае агульныя пытанні узаемадзеяння экалагічнага культурнага асяроддзя на розных этапах станаўлення цывілізацыі, праблемы фарміравання экалагічнай свядомасці людзей, знішчэ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навасферы, разглядае сістэму экалагічнага выхавання: акрэслівае месца і ролі устаноў культуры ў гэтай сістэме.

Спецыяльная экалагічная падрыхтоўка з'яўляецца лагічным прадаўжэннем у выглядзе прывіцця студэнтам праз курс "Арганізацыя экалагічных клубаў" канкрэтных навыкаў арганізацыі аматарскіх аб'яднанняў экалагічнага накірунку (клубы аматараў прыроды, аматараў хатніх жывел, птушак, кветак і г.д.), дзе ажыццяўляецца непасрэднае ўключэнне людзей у рэальную экалагічную дзейнасць.

Прапанаваная мадэль падрыхтоўкі арганізатараў экалагічнага руху ажыццяўлялася на працягу трох гадоў на кафедры самадзейнай творчасці, мела поўны плен і сення неабходна яе далейшае развіццё праз укараненне ў новы вучэбны план "Мэнаджэр сацыя-культурнай сферы".

## ПЫТАННІ АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ КЛУБАЎ І МУЗЕЯЎ

Т.М.Глінік

Адраджэнне нацыянальнай культуры, якое магчыма толькі на шляху дасягнення сапраўднага суверэнітэту Рэспублікі і дапамогі з боку ўрада, і якое мы назіраем ужо сення – складаны і шматпланны працэс. Гісторыя склалася так, што ўзнаўленне, а не знішчэнне нацыянальных каштоўнасцяў, зберагание і памнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны вызначаюць творчую дзейнасць народа і яго імкненні "людзьмі звацца". Больш за шэсцьдзесят гадоў панавання сістэмы, якая мэтанакіравана ўводзіла рускую мову і культуру ва ўсе сферы нашага жыцця, быў моцна падарваны духоўны патэнцыял беларускага народа. Але ж заўседы былі людзі, асабліва мясцовыя жыхары, прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, якія свядома супраціўляліся размыванню нацыянальных асноў, духоўных традыцый роднага краю. Зараз іх лік значна ўзрос, яны аб'ядноўваюцца ў разнастайныя краязнаўчыя суполкі і клубы, адчыняюць грамадскія музеі, дзе ўвачавідкі, праз канкрэтныя рэчы, музейныя "каштоўнасці" імкнуцца "заняць свой пачэсны пасад між



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ